УДК 93/94:63(476)

# Э. АЖЭШКА І СПРОБЫ АДКРЫЦЦЯ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ШКОЛЫ Ў ГНОЙНІЦЫ

**Радзюк А.Р., Галубовіч В.У.**
УА Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Мала хто ведае, што ў жыцці нашай вядомай зямлячкі, пісьменніцы, публіцысткі і грамадскай актывісткі Элізы Ажэшкі ёсць старонкі, звязаныя з гісторыяй развіцця сельскай гаспадаркі на нашых землях. Яна была сапраўдным сябрам Гарадзенскага сельскагаспадарчага таварыства. Больш за тое, Менавіта ў яе маёнтку, што меў не зусім мілагучную назву "Гнойнаўка", гэтым таварыствам была здзейснена спроба па адкрыццю першай у губерні сельскагаспадарчай школы. Але аб усім па парадку.

Праблема падрыхтоўкі сельскагаспадарчых кадраў для патрэб мясцовай гаспадаркі стаяла вельмі востра на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў XIX – пачатку XX ст. Тут можна прыгадаць зварот гарадзенскай шляхты да віленскага генерал-губернатара з просьбай аб дазволе адкрыцця школы тэарэтычнага і практычнага земляробства ў Бярозе Картузскай у 1837 г., а таксама прапановы па стварэнні земляробчага вучылішча ў Свіслачы ў 1856 г. [1, а. 1; 2, а.2-3] Абодва гэтыя праекты не былі рэалізаваныя. З мэтай хоць неяк вырашыць праблему недахопу аграрных спецыялістаў у губерні было заснавана некалькі стыпендый для падтрымкі мясцовых хлопцаў, якіх накіроўвалі на вучобу ў Пятровіцкую і Мар'інагорскую сельскагаспадарчыя навучальныя ўстановы, што знаходзіліся ў суседняй Мінскай губ. Але такім спосабам праблему вырашыць не

ўдавалася, тым больш што выпускнікі тых школ вяртацца на радзіму не спяшаліся.

Штуршком да актуалізацыі пошукаў выйсця з сітуацыі, якая склалася на пачатку XX ст., пэўна, сталі пасяджэнні губернскага і, адпаведна, уезднага камітэтаў "аб патрэбах сельскагаспадарчай вытворчасці", што адбыліся ў Гародні пад старшынствам П. Сталыпіна ў 1902 г. Сярод мноства пытанняў аб асноўных накірунках развіцця аграрнага комплексу рэгіёна, на першым месцы стаяла праблема сельскагаспадарчай адукацыі ў губерні. У дыскусіі, што ўзнікла па гэтым пункце павесткі, былі прапанаваны розныя шляхі яе вырашэння, але перамагла ідэя стварэння спецыялізаваных агранамічных школ. І ўжо ў наступным, 1903 г. гарадзенскае губернскае сельскагаспадарчае таварыства выходзіць з канкрэтным праектам па арганізацыі адпаведнай навучальнай установы. Месцам яе дыслакацыі быў абраны маёнтак Гнойніца, што размяшчаўся ў непасрэднай блізкасці ад гораду і належыў Э. Ажэшцы.

Калі сёння разгледзець нават самую падрабязную карту Гарадзеншчыны, то на ёй вы не знойдзеце населенага пункта з такой назвай. Справа ў тым, што ў 1864 г. савецкія ўлады прынялі рашэнне аб яго перайменаванні на больш мілагучную "Вішнявец", ад якой, у сваю чаргу, быў названы цэлы сучасны мікраараён Гародні. Акт аб куплі-продажы дадзенага маёнтка за 1906 г. дае нам магчымасць прасачыць, якім чынам дадзенае зямельнае валоданне стала ўласнасцю Э. Ажэшкі. З дакумента вынікае, што частка паезуіцкага маёнтка Гнойніца набыла маці Элізы – Францішка Відацкая (прозвішча па другім мужу) у 1854 г., а другая палова куплена ёй жа ў 1877 г. Пасля яе смерці ў 1879 г. адзіным яго ўладаром стала пісьменніца [3, а. 66]. Зразумела, што сама Э. Ажэшка вядзеннем гаспадаркі не займалася. Зямля здавалася ёю ў арэнду за суму 850, а пазней 700 руб. у год [3, а. 11].

З перапіскі па гэтым прадмеце не відаць, хто быў непасрэдным ініцыятарам стварэння сельскагаспадарчай школы на базе азначанага маёнтка. Не выключана, што гэта была сама Э. Ажэшка (у дакументах вельмі часта фігуруе як Нагорская), якая на той час была сябрам сельскагаспадарчага таварыства і была ў курсе ўсіх найбольш надзённых яго патрэб. Гэтае сцвярджэнне знаходзіць сваё пацверджанне ў прадстаўленні віленскага генерал-губернатара на імя Міністра земляробства дзяржаўных маёмасцей, у якім сцвярджаецца, што "дваранка Лізавета Нагорская, з'яўляючыся сябрам Гарадзенскага таварыства сельскай гаспадаркі і жадаючы аказаць падтрымку яго дзейнасці, выказала гатоўнасць уступіць ва ўласнасць Таварыства ...

маёнтак Гнойніцу прастораю 171 дзес.” [3, а. 9]. Кошт маёнтка быў вызначаны гаспадыняй у 20 тыс. руб.

На шляху па рэалізацыі гэтага праекта адразу ўзніклі дзве асноўныя перашкоды. Першая – атрыманне дазволу на ажыццяўленне здзелкі аб куплі-продажы Гнойніцы. Другая – пошук грашовых сродкаў на ажыццяўленне дадзенай транзакцыі і ўтрыманне школы ў будучым.

Сутнасць першай праблемы заключалася ў дзеючым на той час абмежавальным заканадаўстве адносна зямельнай маёмасці асоб каталіцкага веравызнання. Акрамя таго, паезуіцкі статус Гнойніцы накладаў сваю спецыфіку на юрыдычныя нюансы справы. Сітуацыя ў гэтым кірунку развівалася наступным чынам. Наступ вёўся адразу па некалькіх франтах. Мясцовы старшыня сельскагаспадарчага таварыства П. Вяроўкін (ён жа маршалак губернскага дваранства) у 1903 г. накіраваў адпаведныя прашэнні ва ўсе вышэйшыя інстанцыі, ад якіх залежала вырашэнне гэтага пытання. Міністр унутраных спраў Плеве, а таксама віленскі генерал-губернатар ідэю падтрымалі. Яны нават далучылі свае галасы ў падтрымку П. Вяроўкіна. Але галоўнай перашкодай на шляху па рэалізацыі дадзенага праекта стала Міністэрства земляробства і дзяржаўных маёмасцей. З аднаго боку, яно не бачыла юрыдычных падстаў на дазвол па ажыццяўленні запланаванай куплі. З другога – яно ініцыявала праверку маёнтка на месцы з мэтай ацаніць фінансавы бок усёй справы. І тут, пры ажыццяўленні апошняй, выкрыліся досыць цікавыя рэчы. Як паведаміў з месца падзей правяраючы, рэальны кошт Гнойніцы не адпавядаў той цане, за якую Э. Ажэшка імкнулася “перадаць” яго ва ўласнасць таварыства. Як высветлілася, пісьменніца ўжо спрабавала прадаць гэтае зямельнае валоданне мясцовым сялянам за 12 тыс. руб., але тыя адмовіліся з-за высокага, на іх думку, кошту. Сам чыноўнік, што разбіраўся на месцы, таксама ацаніў Гнойніцу ў 12 тыс., лічачы, што суму ў 20 тыс. руб. “Гарадзенскае таварыства сельскай гаспадаркі можа прапанаваць толькі пры жаданні аказаць падтрымку не сабе, а пані Нагорскай” [3, а. 12].

Не спрыялі станоўчаму вырашэнню дадзенай справы і яе фінансавыя аспекты. Зразумела, што таварыства не валодала ўсёй неабходнай сумай для набыцця зямлі, адкрыцця і ўтрымання школы. Але ім быў распрацаваны сапраўдны бізнес-план дадзенага праекта, які прадугледжваў прыцягненне розных крыніц для яго фінансавання. Што праўда, большую іх частку павінны былі складаць адлічэнні з сум губернскіх земскіх збораў, ці, інакш кажучы, дзяржаўных падаткаў.

Аднак насуперак усёй логіцы развіцця ўсіх падзей, 11 кастрычніка 1904 г. быў атрыманы Вышэйшы (гэта азначае імператарскі) дазвол на набыццё, "у выключэнне дзеючага Статута аб кіраванні казённымі маёнткамі ў Заходніх губернях" Гнойніцы Э. Нагорскай. Але чаму гэты праект, нягледзячы на такі доўгачаканы дазвол, не быў рэалізаваны да канца, крыніцы маўчаць. Адзінае, што вядома дакладна, што гэта адбылося не па віне сельскагаспадарчага таварыства.

Нам толькі застаецца здагадвацца, чаму здзелка сарвалася. Магчыма, тут сваю ролю адыграў факт завышанага кошту маёнтка, ці адсутнасць дазволу на выкарыстанне на гэтыя патрэбы дзяржаўнага фінансавання, ці адмова самой Э. Ажэшкі, а можа, пратэст супраць продажу мясцовай сялянскай грамады. Адказ на гэтае пытанне можа даць вывучэнне эпісталярнай спадчыны пісьменніцы гэтага перыяду і прыцягненне новых крыніц. Дакладна вядома, што праз два гады ў 1906 г. Э. Ажэшка прадала Гнойніцу мясцовым сялянам за 14500 руб.

Іронія лёсу. Сельскагаспадарчая школа ўсё ж такі была адкрыта ў маёнтку Э. Ажэшкі. Але адбылося гэта ў іншай мясцовасці – Мількаўшчызне, дзе пісьменніца ў свой час нарадзілася. І адбылося гэта без яе ўдзелу, пасля яе смерці.

**ЛІТАРАТУРА**

1. LVIA. Ф 378 а/а, воп. 1838 г., спр. 881.
2. НГАБ у Гродне. Ф. 1, воп. 28, спр. 904.
3. НГАБ у Гродне. Ф. 31, воп. 1 дад., спр. 70.